Сьвятлана Варонік



...ня здраджвай тым,
хто варты здрады...

# Гліняны сьвет

*    *    *

Не вяртайся ў маю цішыню.
Патаемнасьці споведзь радая.
Дакрануся рукой да агню...
Не баліць.
Не вяртайся
ў маю цішыню...

*    *    *

Хата ў чатыры сьцяны.
Чатыры кірункі сьвету.
З радзінаў да плачу.
З вясельля да новай хаты
у чатыры сьцяны...
У кірунку Вечнасьці.

* * *

Па страсе, па сьцяне
дождж імкне да Цябе,
да зямлі.
Вочы сумам маўчаць.
Скрыжаваныя рукі гавораць...

* * *

Адыходзяць сябры.
Пакідае мама.
Адчуваю нябёсаў біблейскі сум.
Вастрацелыя дні
упіваюцца ў памяць.
Ціха ў Вострую Браму ўвайду.

* * *

Плот пахілы ўрос у зямлю.
Нат здаецца – пусьціў карэньне.
Паміж пальцаў-штыкецін
трава прарастае.
Абмінае маю безнадзейнасьць
пакрыўджаны дзень.

* * *

Ручнікі на бажніцах
маўклівай ахвярай
берагуць цеплыню
апусьцелых хат.
Ручнікі на крыжах
берагуць-блаславуляюць
Шлях.
        Вяртаюся.

* * *

Сабе ня здраджвай і сябрам.
Бацькам.
        Радзіме.
                Хаце.
                        Вёсцы.

Крыжам маўклівым на пагосьце...
Ня здраджвай...
Вера зьберажэ.
Ня здраджвай тым,
хто варты здрады.

* * *

Гліняны сьвет.
Абпалены на сонцы.
Ідуць дажджы.
Расьце ў збанках трава.

* * *

Ціха па вулачках
ноч пахадзіла.
У садзе сьвітальным
лісты ўспамінаюць
сны.

* * *

Белы гатычны касьцёл
з воблакамі размаўляе.
Вежа маю душу
на сьпічаку трымае.
Я горад аберагаю...

* * *

Жыве у гнёздах птушыных вецер.
Калыша галіны дрэваў.
Сьпяшаюся з выраю...

* * *

У мяне ёсьць дрэвы...
Толькі няма Веры,
што ў мяне ёсьць Сад.